УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

УДК 780.645.05 (4-11)

**СУРБА
АЛЯКСАНДР ВІКТАРАВІЧ**

# БЕЛАРУСКАЯ ДУДА Ў КАНТЭКСЦЕ ЎСХОДНЕЕЎРАПЕЙСКАЙ ТРАДЫЦЫІ: ТЫПАЛОГІЯ, КАНСТРУКЦЫЙНЫЯ І ДЭКАРАТЫЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

**АЎТАРЭФЕРАТ**
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата мастацтвазнаўства

па спецыяльнасці 17.00.09 – тэорыя і гісторыя мастацтва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2016

Праца выканана на кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Навуковы кіраўнік: **Барвенава Ганна Аляксандраўна**
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт, загадчык аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва дзяржаўнай навуковай установы “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі”

Афіцыйныя апаненты: **Шаура Рыгор Фёдаравіч**
доктар мастацтвазнаўства, прафесар, загадчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**Казловіч Міхаіл Іванавіч**
кандыдат мастацтвазнаўства, прарэктар па вучэбнай і навуковай рабоце прыватнай установы адукацыі “Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава”

Апаніруючая арганізацыя: **Дзяржаўная ўстанова “Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь”**

Абарона адбудзецца 22 снежня 2016 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры ўстанове адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі ўніверсітэта; e-mail: buk@buk.by; тэл. вучонага сакратара 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.

Аўтарэферат разасланы 22 лістапада 2016 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт А.Я. Корсакава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Дуда – старажытны традыцыйны музычны інструмент і твор дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, распаўсюджаны па ўсёй Еўропе, часткова – на тэрыторыі Паўночнай Афрыкі і Азіі. Выкарыстанне дуды ў традыцыйным асяроддзі было звязана з музычным суправаджэннем абрадавых і забаўляльных мерапрыемстваў, а іх выраб адпавядаў мясцоваму каларыту і эстэтыцы мастацкай традыцыі. На пазначаных абшарах вылучаецца вялікая колькасць лакальных відаў дуды.

У даследаваннях традыцыйнай музычнай культуры разам з вывучэннем пытанняў усеагульнага ўзнікнення еўрапейскіх дудаў, распаўсюджання, бытавання, развіцця і фарміравання іх мастацкіх асаблівасцей, якія не атрымалі пакуль што комплекснага тэарэтычнага абгрунтавання, канстатуецца існаванне і такога старажытнага інструмента, як беларуская дуда, падаюцца факты яе фіксацыі ў пісьмовых і іканаграфічных крыніцах. Аднак пытанні паходжання беларускай дуды, яе ўнікальнасці і ўзаемасувязі з усходнееўрапейскімі дудамі застаюцца не распрацаванымі. Па-за ўвагай айчынных даследчыкаў аказваецца вывучэнне генезісу і эвалюцыі, канструкцыйных і мастацка-дэкаратыўных асаблівасцей беларускіх дудаў, вызначэнне іх месца ва ўсходнееўрапейскай дударскай традыцыйнай культуры. Не высветлены ўмовы знікнення дуды ў сярэдзіне ХХ ст. і яе паступовага адраджэння ў 70-я гг. ХХ ст.

У замежных даследаваннях выкарыстоўваюцца розныя прынцыпы сістэматыкі і асэнсавання мастацкай адметнасці дудаў розных відаў паводле рэгіёнаў іх распаўсюджання, канструкцыі, музычнага строю і інш. Аднак прыналежнасць беларускай дуды да сістэматыкі дудаў свету не знайшла фундаментальнага адлюстравання ў навуковых працах, хоць у музейных фондах Беларусі і замежжа захаваўся шэраг артэфактаў, пісьмовых крыніц з апісаннем беларускай дуды, іканаграфічнага матэрыялу, што з’яўляецца падставай для правядзення дадзенага даследавання, а таксама садзейнічае працэсу ўніфікацыі і распрацоўкі адзінай тыпалогіі ўсходнееўрапейскіх дудаў.

Дысертацыйнае даследаванне абмяжоўваецца вывучэннем усходнееўрапейскіх дудаў як цэласнай групы інструментаў з характэрнымі асаблівасцямі, у склад якой паводле тэрытарыяльнага распаўсюджання ўваходзяць беларускія дуды. Гэта звязана з велізарнай разнастайнасцю відаў дудаў свету, што ўскладняе працэс іх мастацкага аналізу і сістэматыкі. У групе ўсходнееўрапейскіх дудаў, у тым ліку беларускіх, у найбольшай ступені ўтрымліваецца непарыўная мастацка-канструкцыйная традыцыя вырабу гэтых аўтэнтычных інструментаў, што з’яўляецца важнай навуковай падставай для распрацоўкі іх акрэсленай тыпалогіі.

Сучаснае адраджэнне вырабу дудаў ахапіла амаль усю Еўропу. Аналагічная з’ява назіраецца і ў Беларусі, аднак гэты працэс адбываецца стыхійна і не атрымлівае адпаведнай навуковай рэфлексіі. Майстры, якія вырабляюць дуды, падыходзяць да гэтага працэсу як даследчыкі, мастакі і аматары. Прасочваюцца спробы пераймання спосабаў творчага майстэрства іншых усходнееўрапейскіх дударскіх культур. Сярод айчынных майстроў вылучаюцца экперыментатары і прадаўжальнікі традыцыі вырабу дудаў. На аснове аналізу іх творчай дзейнасці неабходна абгрунтаваць мэтазгоднасць пераймання традыцыйнай мастацкай эстэтыкі і мясцовага каларыту ў справе адраджэння і вырабу беларускай дуды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі**

Дысертацыйнае даследаванне выконвалася ў межах комплекснай навукова-даследчай тэмы кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” “Беларускае мастацтва XX ст. ва ўмовах глабалізацыі: кампаратыўны аналіз” (2011–2015), кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” “Праблемы і перспектывы падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы духавога мастацтва Беларусі” (2011–2015) (тэмы зацверджаны на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 21.12.2010, пратакол № 4); комплекснай навукова-даследчай тэмы кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” “Інтэрпрэтацыя вобраза творчай асобы ў беларускім мастацтве XX–XXI стст.: кампаратыўны падыход” (2016–2020), кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” “Актуальныя мастацкія, метадалагічныя і педагагічныя аспекты падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва” (2016–2020) (тэмы зацверджаны на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 12.12.2015, пратакол № 4).

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэта даследавання*: вызначыць канструкцыйныя і мастацка-дэкаратыўныя асаблівасці беларускай дуды і яе месца ва ўсходнееўрапейскай групе дудаў.

*Задачы:*

- ✓ абгрунтаваць агульныя вытокі паходжання ўсходнееўрапейскіх дудаў;
- ✓ вылучыць характэрныя віды беларускай дуды;
- ✓ ахарактарызаваць тыпалагічныя і канструкцыйна-дэкаратыўныя асаблівасці ўсходнееўрапейскіх дудаў;
- ✓ выявіць ўзаемасувязі беларускай і ўсходнееўрапейскіх дудаў на аснове іх марфалогіі;
- ✓ вызначыць этапы і асноўныя напрамкі адраджэння вырабу дудаў у Беларусі ў канцы XX – пачатку XXI ст.

**Навуковая навізна**

Упершыню ў айчынным і сусветным мастацтвазнаўстве падрабязна разгледжаны ўсе вядомыя ўзоры беларускай дуды, праведзена іх параўнанне з усходнееўрапейскімі дудамі паводле канструкцыі і дэкору, распрацавана тыпалогія ўсходнееўрапейскіх дудаў з уключэннем у яе структуру беларускай дуды і вылучэннем найбольш характэрных яе відаў. Паходжанне беларускай дуды разглядаецца ў кантэксце ўсходнееўрапейскай культурнай прасторы, што дазваляе прасачыць прычыны яе ўзнікнення. Упершыню аналізуюцца сучасныя працэсы адраджэння і рэканструкцыі дуды ў Беларусі, вызначаюцца этапы, напрамкі і тэндэнцыі.

Вывучэнне беларускай дуды з’яўляецца надзвычай актуальным для сучаснага мастацтвазнаўства, бо паказвае ролю, якую адыграла беларуская дуда ва ўсходнееўрапейскай дударскай традыцыйнай культуры, дазваляе звязаць разнастайныя па канструкцыйнай і мастацка-дэкаратыўнай варыянтнасці дуды ў сістэму, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адлюстроўвае ўнікальнасць і своеасаблівасць фарміравання і развіцця беларускай дудовай традыцыі ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Беларускія і ўсходнееўрапейскія дуды маюць агульныя карані паходжання. Пра гэта сведчаць прынцыпы канструявання і мастацка-дэкаратыўнай аздобы ўсходнееўрапейскай групы дудаў. Іканаграфічныя крыніцы адлюстроўваюць выявы дудаў толькі з часоў Сярэднявечча, пры гэтым дэманструецца вялікая колькасць іх канструкцыйных відаў, што сведчыць пра развітасць і разнастайнасць гэтага інструмента. Згадкі пра дуды прысутнічаюць і ў ранейшых пісьмовых крыніцах, што пацвярджае гіпотэзу аб іх архаічным узнікненні. У розных гіпотэзах адносна паходжання дудаў час іх з'яўлення разыходзіцца больш чым на тысячу гадоў. Зыходзячы з семантычнага міфічнага значэння дуды, яе канструкцыі, элементаў дэкору, становіцца відавочным, што такая з'ява, як дуда, звязана з сумежнымі традыцыйнымі міфічнымі ўяўленнямі. Генезіс беларускай дуды падпарадкаваны агульнай культурнай усходнееўрапейскай прасторы, а яе канструкцыя і мастацка-дэкаратыўная аздоба адпавядаюць мясцовым эстэтычным канонам з улікам агульных арнаментальных матываў усходнееўрапейскай дудовай групы.

2. Беларускай дудой называецца духавы язычковы музычны інструмент, які складаецца з некалькіх трубак, часцей устаўленых у скураны мех. Выдзяляецца чатыры віды беларускай дуды, якія аб'ядноўваюцца на аснове канструкцыі і дэкору. Першы від – бязмехавая дуда – складаецца толькі з дзвюх музычных трубак. Другі від – аднагукавая дуда, якая прадстаўлена найбольшай колькасцю знойдзеных артэфактаў, – мае сшыты скураны мех, адну іграву трубку пад назвай "перабор", другую – басовы "гук" з драўлянымі раструбамі-рагаўнямі. На трубках, ражках-раструбах і перахадніках прысутнічае дэкор волавам у выглядзе кольцаў, пілападобнага элемента і нахіленых палосак. Трэці від – двухгукавая дуда – спалучае суцэльны мех з устаўленымі ў яго пераборам і двума гукамі з раструбамі-самародкамі, дэкор адсутнічае. Чацвёрты від – дуда-мацянка – уяўляе сабой сшыты скураны мех з устаўленымі ў яго пераборам і трыма гукамі ў адным перахадніку, дэкор адсутнічае. Пазначаныя віды беларускай дуды маюць агульнаеўрапейскія карані, аднак адрозніваюцца па канструкцыйных і дэкаратыўных параметрах. Найбольш характэрная, дасканалая па канструкцыі і дэкоры беларуская дуда – аднагукавая. Яна вылучаецца выверанымі канструкцыйнымі прапорцыямі, мае завершанае мастацка-дэкаратыўнае аздабленне. Двухгукавая дуда з'яўлялася гістарычным прататыпам аднагукавай дуды.

3. Усходнееўрапейская група дудаў вельмі разнастайная па канструкцыі і дэкоры. Дудам уласцівы: цыліндрычны музычны канал, выкарыстанне толькі адзінарнага пішчыка, наяўнасць у аздобе вобраза казы, дэкарыраванне волавам або дэкаратыўная знешняя разьба па дрэве. Тыпалогія ўсходнееўрапейскай групы дудаў грунтуецца на аснове іх тэрытарыяльна-канструкцыйных асаблівасцей і ўключае: заходні, заходнебалканскі, цэнтральнабалканскі, усходнебалканскі і скандынаўска-балтыйскі тыпы. Беларуская дуда адносіцца да заходняга тыпу ўсходнееўрапейскай групы дудаў разам з літоўска-аўкштайцкімі, польскімі, чэшскімі і ўсходнегерманскімі дудамі, што абумовіла наяўнасць у канструкцыі айчыннага інструмента адзінарнага перабору, басуючага гуку і вялікіх ражкоў-раструбаў, у дэкоры – інкрустацыя волавам у форме кольцаў, пілападобнага элемента, нахіленых палосак, а таксама стылізаванага вобраза

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

казы. Дуды заходнебалканскага тыпу ўяўляюць сабой інструменты з падвойным пераборам без басуючага гуку, у якім адсутнічаюць раструбы на трубках (лакалізуюцца ўздоўж Адрыятычнага ўзбярэжжа і раёна Босніі-Герцагавіны, Албаніі, Грэцыі і вострава Крыт). У якасці дэкору выкарыстоўваецца геаметрычная разьба. Цэнтральнабалканскі тып дуды адрозніваецца падвойным пераборам з басуючым гукам (лакалізаваны ад Славеніі, Паўночнай Сербіі і Баната на Поўдні да Паўднёвай Польшчы і часткі Заходняй Украіны). У якасці дэкору выкарыстоўваецца інкрустацыя волавам і іншымі металамі, прысутнічае стылізаваная галава казы. Усходнебалканскаму тыпу дудаў уласцівы просты (адзінарны) перабор, адзін басуючы гук і рудыментарны раструб на пераборы (лакалізуецца ў Балгарыі, Македоніі, часткова Румыніі, часткова Сербіі, Малдове і – эпізадычна – у Крыме), дэкор прысутнічае эпізадычна ў якасці інкрустацыі волавам (кольцы, пілападобны элемент, палоскі і інш.). У дудах скандынаўска-балтыйскага тыпу назіраецца наяўнасць простага перабору і басуючага гуку, адсутнасць ражкоў-раструбаў і дэкору металам (лакалізуюцца на тэрыторыях Швецыі і Эстоніі).

4. Пераважная большасць усходнееўрапейскіх дудаў па падабенстве канструкцыйных і мастацка-дэкаратыўных элементаў адпавядае распрацаванай аўтарам тыпалогіі. Па канструкцыйных асаблівасцях беларуская дуда блізкая да ўсходнебалканскага і скандынаўска-балтыйскага тыпаў, але з ражком-раструбам, а па мастацка-дэкаратыўных асаблівасцях (прынцыпу тачэння трубак “праз тор”, дэкору волавам у выглядзе кольцаў, пілападобнаму элементу і нахіленых палосках) блізкая да заходняга і ўсходнебалканскага тыпаў. Унікальныя асаблівасці беларускай дуды ў дачыненні да ўсходнееўрапейскай групы: форма ражкоў-раструбаў (плаўна закручаная на 180 градусаў), наяўнасць на іх дэкору волавам у выглядзе стылізаванай галавы казы, тачэнне трубак з малюнкам “тор – бочачка – тор”.

5. У канцы XIX – першай палове XX ст. беларуская дуда пачала знікаць, і да 70-х гг. XX ст. ніводнага носьбіта традыцыі вырабу дудаў не засталося. Таму працэс, які распачаўся з канца 1970-х гг. і доўжыцца па сённяшні дзень, варта назваць адраджэннем справы вырабу беларускіх дудаў, што прайшла некалькі этапаў: першы (1970-я гг.), другі (1980-я – пачатак 1990-х гг.), трэці (пачатак 1990-х – пачатак 2000-х гг.), чацвёрты (пачатак 2000-х гг. – наш час). Майстроў, якія займаліся вырабам дудаў, можна аднесці да “посттрадыцыйных” (эксперыментатараў) і “неатрадыцыйных” (падаўжальнікаў традыцыі) у адпаведнасці з напрамкамі іх дзейнасці. Стыхійна ўзнікшы посттрадыцыйны напрамак характарызуецца эксперыментальна-аўтарскім падыходам да майстравання дудаў, пераасэнсаваннем традыцыйнай дударскай спадчыны. Неатрадыцыйны напрамак абумоўлівае спалучэнне непасрэднага вырабу дудаў адначасова з даследаваннем традыцыйных узораў беларускіх дудаў і арыентацыяй на іх у працэсе творчай рэканструкцыі. Неатрадыцыйнае майстраванне дудаў прадстаўлена дзвюма майстэрнямі – “Майстэрняй Алеся Ларся” і “Майстэрняй Тодара Кашкурэвіча”, якія адрозніваюцца своеасаблівымі мастацкімі і тэхналагічнымі прыёмамі рэканструкцыі інструментаў. Пастаянныя пошукі і імкненне даследаваць і адаптаваць беларускія віды дудаў да сучаснай мастацкай культуры Беларусі, пераемнасць мастацкіх усходнееўрапейскіх дудовых традыцый з’яўляюцца ў працэсе адраджэння вырабу старажытных інструментаў галоўнымі. Перспектыўнай і прагрэсіўнай тэндэнцыяй у аўтарскай рэканструкцыі дудаў становіцца выраб канструкцыйных частак і дэкору дуды паводле прынцыпу “залатога сячэння”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя выканана аўтарам самастойна і з’яўляецца першым у айчынным і сусветным мастацтвазнаўстве даследаваннем мастацка-дэкаратыўных і канструкцыйных асаблівасцей традыцыйнай беларускай дуды, яе месца ва ўсходнееўрапейскай дудовай групе. Аўтарам абгрунтавана агульнае паходжанне ўсходнееўрапейскіх, у тым ліку беларускіх, дудаў, прапанавана гіпотэза аб паходжанні беларускай дуды. Вылучаны чатыры віды беларускай дуды паводле канструкцыі і мастацка-дэкаратыўных асаблівасцей. Распрацавана тыпалогія ўсходнееўрапейскіх дудаў з вызначэннем месца ў ёй беларускай дуды. Ахарактарызаваны тыпалагічныя асаблівасці ўсходнееўрапейскай дудовай групы, пабудаваны графічныя ілюстрацыі ўзаемасувязей паміж імі. Выяўлены падабенства і адрозненне ўсходнееўрапейскіх і беларускіх дудаў. Вызначаны этапы, асноўныя напрамкі і тэндэнцыі адраджэння вырабу дудаў у Беларусі ў канцы XX – пачатку XXI ст. У дачыненні да беларускіх дудаў у навуковы зварот уведзены значны фактaлагічны матэрыял, сабраны падчас 12 экспедыцый па музеях і прыватных калекцыях (у выніку экспедыцый было зроблена больш за 300 фотафіксацый, выкананы прамалёўкі і эскізы дудаў і іх частак, якія прыведзены ў дадатку (фотаздымкі і аўтарскія графічныя матэрыялы).

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Вынікі даследавання прадстаўлены на 20 рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцыях: міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Архетипы и архетипическое в культуре и социальных отношениях” (РФ, г. Пенза, навукова-выдавецкі цэнтр “Сацыясфера”, 5–6 сакавіка 2010 г.); міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Этногенез и ранняя история Евразии” (РФ, г. Пенза, навукова-выдавецкі цэнтр “Сацыясфера”, 5–6 красавіка 2010 г.); міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества” (г. Мінск, ІСЗ, 15 красавіка 2010 г.); навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў “Беларуская традыцыя ў еўрапейскай прасторы: 65 гадоў пасля Вялікай Перамогі” (г. Мінск, БДУКіМ, 15–16 красавіка 2010 г.); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання” (г. Мінск, БДУКіМ 29–30 красавіка 2010 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі “Роля традыцый народнай культуры ў адраджэнні беларускага сяла” (г. Іванава, НАН Беларусі, 24 верасня 2010 г.); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Miendzy panem, wojtem a plebanem” (РП, г. Познань, Таварыства сяброў навукі, 25–26 лістапада 2010 г.); навукова-практычнага семінару “Совершенствование эстетического образования в XXI в.” (г. Мінск, БДПУ, 22 снежня 2010 г.); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Актуальные проблемы мировой художественной культуры” (г. Мінск, БДУКіМ, 25–26 сакавіка 2011 г); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання” (г. Мінск, БДУКіМ, 29 красавіка – 1 мая 2011 г.); міжнароднай завочнай навуковай канферэнцыі “Культура: открытый формат – 2011” (г. Мінск, БДУКіМ, 1 жніўня 2011 г.); навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў Рэспублікі Беларусь “НИРС-2011” (г. Мінск, БДУ, 18 кастрычніка 2011 г.); навуковай канферэнцыі “Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі” (Мінск, БДУКіМ, 3 снежня 2011 г.); навукова-практычнай канферэнцыі “Дударская музыка Беларусі. Актуальныя пытанні рэканструкцыі” (музейны комплекс Дудуткі, Дударскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

клуб, 11 снежня 2011 г.); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання” (г. Мінск, БДУКіМ, 27–29 красавіка 2012 г.); міжнароднай завочнай навуковай канферэнцыі “Культура: открытый формат – 2012” (г. Мінск, БДУКіМ, 14 лістапада 2012 г.); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання” (г. Мінск, БДУКіМ, 26–28 красавіка 2013 г.); міжнароднай завочнай навуковай канферэнцыі “Культура: открытый формат – 2013” (г. Мінск, БДУКіМ, 25 чэрвеня 2013 г.); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання” (г. Мінск, БДУКіМ, 25–27 красавіка 2014 г.); навукова-практычнай канферэнцыі “Дударскі фэст” (музейны комплекс Дудуткі, Дударскі клуб, 30 мая 2015 г.); міжнароднай навуковай канферэнцыі “Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання” (г. Мінск, БДУКіМ, 29 красавіка – 1 мая 2016 г.).

**Апублікаванасць вынікаў даследавання**

По тэме дысертацыйнага даследавання апублікаваны 23 матэрыялы: 4 артыкулы ў рэцэнзаваных выданнях, 8 артыкулаў у навуковых зборніках, 8 матэрыялаў канферэнцый, 1 артыкул у часопісе, 1 артыкул у энцыклапедычным даведніку, 1 вучэбная праграма. Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 4,2 аўтарскія аркушы.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох раздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу і дадатку. Агульны аб’ём дысертацыі – 580 старонак, з іх 139 старонак займае асноўны тэкст, 23 старонкі – бібліяграфічны спіс, які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (277 найменняў на беларускай, рускай, англійскай, французскай, нямецкай, чэшскай, венгерскай і іншых мовах) і спіс публікацый саіскальніка (20 найменняў на беларускай мове, 3 найменні на рускай мове), дадатак займае 418 старонак (асобны том).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** аргументуецца выбар тэмы дысертацыйнага даследавання і яе актуальнасць, абгрунтоўваецца сувязь працы з навуковымі праграмамі і тэмамі, фармулююцца мэта, задачы, асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, вызначаюцца навуковая навізна, асабісты ўклад саіскальніка, адлюстроўваецца апрабацыя вынікаў даследавання, колькасць апублікаваных прац, структура і аб’ём дысертацыі.

**Раздзел першы “Гісторыка-тэарэтычныя асновы даследавання дуды”** ўключае тры падраздзелы і прысвечаны выяўленню ступені вывучанасці дуды ў навуковых і іншых крыніцах, пытанням і праблемам генезісу дуды, а таксама распрацоўцы тыпалогіі ўсходнееўрапейскіх дудаў паводле іх канструкцыі і дэкору.

***У падраздзеле 1.1 “Аналітычны агляд літаратуры. Метадалогія і метады даследавання”*** прадстаўлены аналіз літаратуры, прысвечанай распаўсюджанню, бытаванню, канструкцыйнаму і мастацкаму аздабленню дудаў.

Падчас працы над дысертацыяй былі прааналізаваны навуковыя даследаванні, прысвечаныя традыцыйнай дудзе: работы М. Нікіфароўскага (“Дудар і музыка”), Е. Раманава (“Выміраючы інструмент”), публікацыі М. Анімэле, П. Бяссонава,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. Бяляева, К. Квіткі і інш., якія пісалі пра беларускую дуду ў этнаграфічным кантэксце, фіксуючы факты яе наяўнасці пераважна ў Віцебскай вобласці, а таксама раскрываючы асаблівасці яе бытавання. Першая спроба абагульніць інфармацыю аб музычных інструментах, у тым ліку і аб беларускай дудзе, была здзейснена М. Прывалавым у працы "Народныя музычныя інструменты Беларусі", дзе прыведзена асноўная канструкцыя дуды, зроблена спроба інтэграваць яе ў дудовую групу Еўропы, а таксама выказана гіпотэза аб паходжанні гэтага інструмента. М. Прывалаў упершыню акрэсліў кола праблем, звязаных з неабходнасцю распрацоўкі тыпалогіі дудаў.

Публікацыі К. Верткава ў "Атласе музычных інструментаў народаў СССР" рэпрэзентуюць беларускую дуду побач з іншымі дудамі (латышскімі, эстонскімі, украінскімі і інш.), аднак беларуская дуда падаецца аўтарам толькі з пункту гледжання канструкцыі і музычнага строю. У кнізе І. Назінай "Беларускія народныя музычныя інструменты: самазвучныя, ударныя, духавыя" раскрываецца шырокае кола пытанняў, звязаных з беларускай дудой, такіх як узнікненне, распаўсюджанне, канструкцыя, рэпертуар. Даследаванні А. Скарабагатчанкі ўтрымліваюць матэрыялы іканаграфічнага характару, аўтар падрабязна спыняецца на канструкцыі беларускіх дудаў, творчым падыходзе да іх майстравання. Даследаванні Т. Кашкурэвіча і В. Кульпіна закранаюць пытанні рэпертуару, паходжання і "міфалогіі" дуды. Пытаннямі паходжання беларускай дуды і яе бытавання займаліся А. Лось, З. Сасноўскі, У. Маргенштэрн. Спроба параўнаць беларускія і польскія дуды належыць А. Аліферэнку, а спроба прасачыць сувязь дуды і асобы дудара ў традыцыйнай беларускай культуры – С. Яруку. Такім чынам, пазначаныя працы толькі закранаюць тэмы апісання канструкцыі дуды, яе бытавання, паходжання і фіксацыі рэпертуару. Адсутнічае ўсебаковы аналіз захаваных узораў беларускіх дудаў. Да сённяшняга часу не даследаваны канструкцыя, мастацка-дэкаратыўнае аздабленне, не распрацавана тыпалогія ўсходнееўрапейскіх дудаў, не вызначана месца беларускай дуды ва ўсходнееўрапейскай групе дудаў.

У даследаваннях, якія належаць Г. Балфару, Э. Бейнсу, Т. Поднасу і інш., прысвечаных дудам – інструментам, што распаўсюджаны па ўсім свеце, – разгледжаны пытанні канструкцыі, элементаў дэкору, узнімаюцца некаторыя праблемы тыпалогіі дудаў, звязаныя з іх прыналежнасцю да канкрэтнага рэгіёна. Даследчыкі прапаноўваюць для сістэматызацыі дудаў абапірацца на прынцып распаўсюджання дудаў паводле іх канструкцыі, што было часткова імі выкарыстана пры даследаваннях чэшскіх, румынскіх, нямецкіх, славацкіх і іншых усходнееўрапейскіх дудаў. Аднак існуюць даследаванні (пераважна польскай дуды), у якіх распрацоўку тыпалогіі дудаў абумоўлівае тып музычнага строю інструмента (Я. Петрушынска, З. Пшэрэмскі). У большасці прааналізаваных даследаванняў прасочваецца імкненне аўтараў прытрымлівацца асабіста распрацаванай тыпалогіі ўсходнееўрапейскіх дудаў, якая між тым не можа быць прыстасавана да абагульненай тыпалагізацыі дудаў з іншых рэгіёнаў.

Эмпірычны падыход да апісання канструкцыі і аналізу дэкору ўсходнееўрапейскіх дудаў грунтоўна пададзены ў працах Т. Поднаса, П. Чыпа, Б. Гарая, М. Рэйнберга, Я. Петрушынскай і інш., аднак фундаментальных даследаванняў, прысвечаных менавіта дэкору дудаў, не існуе. Найбольш сістэматычна і ўніверсальна дэкор вугорскіх дудаў разглядаецца ў манаграфіі А. Ломеля "Семіятычная арганалогія: дуда і калёсная ліра на Вугоршчыне". Даследчык распрацаваў схему падачы прамалёвак дэкору і канструкцыі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вугорскіх дудаў, што стала для аўтара дысертацыі метадалагічнай асновай у падыходах да вывучэння канструкцыі і дэкору беларускіх дудаў.

У шэрагу даследаванняў адсутнічаюць эскізы інструментаў, фіксуюцца канструкцыйныя элементы дудаў, але для іх абазначэння не існуе адзінай тэрміналогіі, прапануецца тыпалогія, распрацаваная па лакальным прынцыпе, выказваюцца шматлікія гіпотэзы наконт паходжання дуды. Да цяперашняга часу застаецца нераспрацаванай агульная тыпалогія ўсходнееўрапейскіх дудаў, адсутнічае аналіз іх канструкцыйных элементаў, мастацка-дэкаратыўнага аздаблення, не сістэматызаваны факты паходжання дуды, не вызначана месца беларускай дуды ва ўсходнееўрапейскім культурным кантэксце.

У гэтай сувязі аб’ектам даследавання становяцца ўсходнееўрапейскія і беларускія дуды як артэфакты мастацкай культуры, а прадметам – іх канструкцыйныя і мастацка-дэкаратыўныя асаблівасці, што дазваляе ўпершыню ў навуковы зварот увесці апісанне захаваных беларускіх дудаў і раскрыць прынцыпы іх мастацкай рэканструкцыі, распрацаваць агульную тыпалогію ўсходнееўрапейскіх дудаў, вызначыць месца беларускай дуды ва ўсходнееўрапейскай дудовай групе.

*Метадалагічную аснову* даследавання складаюць агульнанавуковыя метады, метад кампаратыўнага аналізу, гісторыка-марфалагічны (вывучэнне канструкцыі, матэрыялу, спосабу вырабаў дэкору, акустыка-тэхнічных параметраў музычнага інструмента, характару функцыянавання і гістарычнага развіцця яго формы, узаемадзеяння канструкцыі дуды і практыкі яе выкарыстання) і тыпалагічны (аб’яднанне дудаў у групы на аснове вызначэння агульных характарыстык), а таксама метады мадэлявання (пабудова тэарэтычнай мадэлі на аснове аналізу артэфактаў), графічнай візуалізацыі (фіксаванне аб’екта даследавання ў графічнай форме).

***У падраздзеле 1.2 “Генезіс і семантыка дудаў. Этымалогія назваў”*** разглядаюцца пытанні генезісу дуды, яе эвалюцыйнага шляху, абгрунтоўваюцца агульныя вытокі паходжання беларускай і ўсходнееўрапейскіх дудаў, праводзіцца аналіз этымалогіі лакальных назваў усходнееўрапейскіх дудаў.

Дуда – інструмент архаічны, пра што сведчаць яе канструкцыя (скураны мех з музычнымі трубкамі) і мастацка-дэкаратыўнае аздабленне (кольцы з волава, стылізаваная галава казы). Пры разглядзе пытання аб паходжанні дуды даследчыкі акцэнтуюць увагу на адным альбо некалькіх аспектах, на аснове якіх будуюць сваю “арыгінальную” гіпотэзу. Так, паводле іканаграфічных крыніц, дуда дакладна вядома ў Еўропе з XII, а ў Беларусі – з XV ст. (Радзівілаўскі летапіс). Аднак пры аналізе розных крыніц становіцца відавочна, што жорсткай прывязкі выяў да канкрэтнай лакальнай дудовай традыцыі не назіраецца (дуда паказана схематычна і ўмоўна). Паводле літаратурных крыніц, вядома, што дуды сустракаліся ўжо ў Старажытным Рыме (прыкладна з I ст. н.э.). Даследчыкі антычных міфаў і культаў (К. Керэны, Ф. Зялінскі і інш.) гавораць аб існаванні ў той час “магічнага скуранога меха”, які надзімаўся пад гукі аўлосаў (грэц. αὐλός – духавы язычковы інструмент), што ўказвае на вельмі архаічную і нават містычную прыроду паходжання дуды.

На падставе аналізу шматлікіх гіпотэз паходжання дуды аўтар дысертацыі выдзяляе чатыры асноўныя: міфічную, старажытнарымскую, сярэднявечна-сакральную і сярэднявечна-тэхнічную.

*Міфічная* гіпотэза ўключае самыя раннія этапы з'яўлення музычных інструментаў, у тым ліку дуды, звязаныя перш за ўсё з культамі Дыяніса і Кібелы ў эпоху Антычнасці. Згодна з гэтай гіпотэзай, прататыпы дуды (аўлосы з мехам) з'явіліся спачатку ў антычных культах (ахвяра казы, святы скураны мех, перараджэнне Дыяніса і інш.), затым адбылася трансфармацыя ў дуду (скураны мех, музычнае суправаджэнне містэрый і аргіястычных культаў). Зыходзячы з такой акалічнасці, можна сцвярджаць, што ўсе дуды свету змяшчаюць у сабе архетып перараджэння антычнага бога Дыяніса. Гэтая акалічнасць дае магчымасць даследаваць дуду як другасную з'яву ў дачыненні да музычна-культавага асяроддзя.

Паводле *старажытнарымскай* гіпотэзы, дуда з'яўляецца на мяжы нашай эры (I ст. н.э.). Вядома, што ў старажытным Рыме інструмент такога кшталту ўжо існаваў. Магчыма, у гэты перыяд з'явілася дуда ў традыцыйным выглядзе (скураны мех з драўлянымі трубкамі). Галоўным аргументам на карысць гэтай гіпотэзы выступае тэхнічны прагрэс таго часу, які дакладна рэалізаваўся ў канструкцыі больш дасканалага музычнага інструмента – "гідраўласа".

Паводле *сярэднявечна-сакральнай* гіпотэзы, дуда з'яўляецца ў Еўропе толькі пасля XI ст., што часткова пацвярджаецца іканаграфічнымі помнікамі Сярэднявечча. У гэты час пачынаюць шырока распаўсюджвацца арганы (духавы механічны музычны інструмент) і дуды, што сведчыць аб узмацненні сакралізаваных хрысціянскіх матываў, якія пачынаюць ускосна ўплываць на працэс узнікнення дудаў.

*Сярэднявечна-тэхнічная* гіпотэза падобная да папярэдняй, аднак у ёй на першы план выходзяць толькі тэхнічныя магчымасці інструмента ў працэсе яго майстравання.

Па характары распаўсюджання дудаў у розных рэгіёнах аўтарам выяўлены іх *"міграцыйныя" шляхі*: дывергентны і канвергентны. Дакладна невядома, ці з'явілася дуда ў адным канкрэтным месцы і ў далейшым іміграvала, ці яна адначасова сфарміравалася ў розных культурах. Аднак факт існавання ў розных відах дудаў падобных элементаў канструкцыі і дэкору, а таксама наяўнасць агульнага (міфічнага) паходжання дуды (прысутнасці вобраза казы) указваюць на глыбокія агульныя карані феномена гэтага інструмента ва Усходняй Еўропе.

Кожная гіпотэза ўтрымлівае шмат аргументаў на сваю карысць, але разам з тым у іх прысутнічаюць і недакладнасці. Верагодней за ўсё, эвалюцыя дудаў праходзіла як этапы росквіту, так і забыцця. Беларуская дуда як частка ўсходнееўрапейскай дудовай групы падпарадкоўваецца агульнаеўрапейскім тэндэнцыям міжкультурнай пераемнасці. Хоць дакладна невядома, ці з'явілася дуда ў Беларусі самастойна альбо была запазычана, усё ж можна сцвярджаць, што яе карані ўзыходзяць да глыбокай старажытнасці і, відавочна, былі пераняты разам з яе канструкцыяй (мех, драўляныя трубкі, вобраз казы).

Такім чынам, аўтарам даследавання прапанавана наступная *фармулёўка генезісу беларускай дуды*: беларуская дуда мела сакральна-міфічныя карані; у часы хрысціянства яна страціла сакральнае значэнне і пачала развівацца самастойна паводле формы; у XIX ст., набыўшы класічны выгляд, яна ўсё ж захавала знешнія праявы былога статусу ў міфалагічнай сістэме архаічнай культуры.

Этымалогія назваў усходнееўрапейскіх дудаў і іх частак, паводле аналізу філалагічных даследаванняў, уключае такія назвы, як "мех", "трубка", "каза" ў перакладзе на адпаведныя мовы, што сведчыць *аб агульных уяўленнях пра дуду* ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***У падраздзеле 1.3 “Тыпалогія і раяніраванне ўсходнееўрапейскіх дудаў”*** усходнееўрапейскія дуды сістэматызаваны на аснове распрацаванай тыпалогіі, якая грунтуецца на канструкцыйных асаблівасцях інструментаў і суадносіцца з канкрэтнай тэрытарыяльнай прыналежнасцю артэфактаў. Інструменты, якія адпавядаюць назве “дуда”, уключаюць наступныя канструкцыйныя элементы: скураны мех, перабор, гук (у некаторых выпадках аб’яднаны з пераборам), удуўная трубка, рагаўні-раструбы (могуць адсутнічаць або быць у рудыментарнай форме).

У першую чаргу асновай для распрацоўкі тыпалогіі ўсходнееўрапейскіх дудаў сталі іх канструкцыйныя адрозненні. Канцэптуальным базісам паслужылі напрацоўкі Э. Бейнса, якія былі прапанаваныя ў 1960-я гг. і з таго часу не змяняліся. Яны прадугледжваюць падзел усіх вядомых еўрапейскіх дудаў па групах на *прымітыўныя, заходнееўрапейскія, італьянскія, усходнееўрапейскія*, што прадыктавана як канструкцыйнымі асаблівасцямі інструментаў, так і жорсткай іх прывязкай да канкрэтных тэрыторый (усходнееўрапейскія дуды з цыліндрычным ігравым каналам перабору, а заходнееўрапейскія – з канічным ігравым каналам перабору). З-за абмежаванай колькасці апублікаваных матэрыялаў, прысвечаных беларускай дудзе, распрацаваная Э. Бейнсам тыпалогія дудаў амаль не закранае гэтае пытанне. Даследчык дае агульнае апісанне рэгіянальных межаў і асаблівасцей распаўсюджання ўсходнееўрапейскіх дудаў. Згадваецца толькі, што беларуская дуда таксама павінна ўваходзіць у дадзеную групу. Апроч таго, распаўсюджанне ўсходнееўрапейскіх дудаў не размяжоўвалася з усходу, таму да апошняга часу гэтая праблема заставалася нявырашанай.

Аўтарам дысертацыйнага даследавання прапанавана поўная тыпалогія ўсходнееўрапейскай групы дудаў з акрэсленымі межамі распаўсюджання, у якой выдзелены пяць асноўных лакальных тыпаў дудаў: *заходні, заходнебалканскі, цэнтральнабалканскі, усходнебалканскі, скандынаўска-балтыйскі,* якія складаюцца з лакальных відаў (дудаў). Арэал распаўсюджання дадзенай групы дудаў не зусім супадае з геаграфічнай тэрыторыяй Усходняй Еўропы і з’яўляецца ў пэўнай ступені ўмоўным. Усходняй мяжой распаўсюджання дудаў, што пацвярджаецца артэфактамі, з’яўляюцца поўнач Беларусі, Літва (з геаграфічнага пункту гледжання гэта Цэнтральная Еўропа). У еўрапейскай частцы Расіі дуды не былі выяўлены, у той час як у астатніх яе рэгіёнах распаўсюджваліся дуды рознага кшталту, такія як шапар, шувыр, сарнай, (аднак яны адносяцца да іншых тэрытарыяльных дудовых груп і не ўваходзяць у кола праблем дадзенага даследавання). Заходняй часткай распаўсюджання ўсходнееўрапейскіх дудаў з’яўляюцца тэрыторыі Усходняй Германіі і Чэхіі, а паўднёвай – тэрыторыі Балканскага паўвострава.

Такім чынам, да *заходняга тыпу* адносяцца дуды са звычайным пераборам і басуючым гукам (заходнеславянскія “бок”, а таксама дуды з вялікімі ражкамі-раструбамі) (лакалізацыя: Багемія, Маравія, Чэхія, Усходняя Германія, Літва, Беларусь); да *скандынаўска-балтыйскага* – дуды са звычайным пераборам і басуючым гукам і адсутнасцю раструбаў (лакалізацыя: Швецыя, Эстонія, часткова Латвія, па некаторых звестках – Фінляндыя); да *заходнебалканскага* – дуды з падвойным пераборам без басуючага гуку, без раструбаў на трубках (лакалізацыя: уздоўж Адрыятычнага ўзбярэжжа і раёна Босніі-Герцагавіны); да *цэнтральнабалканскага* – дуды з падвойным пераборам і басуючым гукам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(Карпацка-Дунайская група, у якой адзін з перабораў точыцца з раструбам або ўмацаваны з другім накшталт гуку) (лакалізацыя: ад Славеніі, Паўночнай Сербіі і Баната на Поўдні да Паўднёвай Польшчы і часткі Украіны); да *ўсходнебалканскага* – дуды са звычайным пераборам і басуючым гукам (балгарская дуда-гайда без раструбаў або з рудыментарнымі раструбамі) (лакалізацыя: Македонія, Балгарыя, частка Румыніі і Сербіі).

Дадзеныя тыпы згрупаваны аўтарам дысертацыі па лакальных канструкцыйных асаблівасцях, што дало падставу даследаваць іх, вылучаючы агульныя і адметныя рысы.

**Раздзел другі "Беларуская дуда ў складзе ўсходнееўрапейскай дудовай групы"** ўключае тры падраздзелы, якія прысвечаны дэталёваму аналізу канструкцыі і мастацка-дэкаратыўнаму аздабленню беларускай дуды, характарыстыцы тыпалагічных асаблівасцей усходнееўрапейскай групы дудаў і выяўленню ўзаемасувязей паміж імі.

***У падраздзеле 2.1 "Беларускія дуды паводле канструкцыі і дэкору"*** падрабязна аналізуюцца ўсе вядомыя на сённяшні час беларускія дуды, у тым ліку паводле архіўных фотаздымкаў (з фондаў музеяў Беларусі, Расіі, Польшчы, Літвы, Германіі), з падрабязнымі прамалёўкамі ўсіх канструкцыйных і дэкаратыўных элементаў.

Беларускія дуды паводле канструкцыі падзелены на чатыры віды.

*Першы від – бязмехавая (бяскорпусная) дуда* – вядомы па апісаннях М. Нікіфароўскага. Канструкцыйна дадзеная дуда ўключае толькі перабор і гук, на якіх аднmissing часова ігралі шляхам змяшчэння абодвух пішчыкаў у ротавую поласць. Выява дадзенай дуды не захавалася, але такая канструкцыя папярэднічае з'яўленню скуранога меха і ўказвае на архаічныя карані бытавання дуды, сведчыць пра пэўную карэляцыю са старажытным антычным інструментам – аўлосам.

*Другі від – аднагукавая дуда* – найбольш часта прадстаўлены на фотаздымках і ў музейных фондах. У даследаванні сабраны ўсе вядомыя факты і артэфакты, што датычацца гэтага інструмента. Паводле сведчанняў этнографаў М. Нікіфароўскага, Е. Раманава, М. Анімэле і інш., аднагукавая дуда ўключае скураны мех, прашыты адной або дзвюма строчкамі праз тасьму, а таксама адзінарны перабор і адзін гук з ражкамі-раструбамі. Аўтарам дысертацыйнага даследавання зроблены падрабязны аналіз аднагукавых дудаў на падставе фотаздымкаў, на якіх змяшчаюцца дудары з дудамі пачатку XX ст. Дуды прамаляваны аўтарам і візуалізаваны ў зручнай форме, што адлюстравана ў дадатку да дысертацыі. Зроблены вывад, што дадзеныя інструменты выкананы ў адной манеры з невялікімі адхіленнямі. Акрамя таго, падчас працы ўдалося выявіць важную асаблівасць: на большасці беларускіх аднагукавых дудаў прысутнічае дэкор воласам (кольцы, пілападобны элемент, нахіленыя палоскі, а таксама стылізаваная галава казы). Даследаваны беларускія аднагукавыя дуды з музейных калекцый Беларусі (Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей, Лепельскі раённы краязнаўчы музей, Музей старажытнабеларускай культуры пры НАН Беларусі), а таксама замежжа (Літоўскі нацыянальны музей у г. Вільнюсе, Расійскі этнаграфічны музей у г. Санкт-Пецярбургу, Музей музычнай культуры імя М. Глінкі ў г. Маскве). Разгледжаныя інструменты дэманструюць аднатыпнасць беларускіх аднагукавых дудаў. Тэхналагічны падыход да вырабу гэтых інструментаў прынцыпова адрозніваецца, што сведчыць пра розны мастацка-тэхнічны ўзровень майстроў-дудароў.

Беларускія аднагукавыя дуды былі лакалізаваны ў Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай абласцях. Дадзены від дуды адносіцца да ўсходнееўрапейскай групы дудаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заходняга тыпу, бо канструкцыйна спалучае мех, адзін гук і перабор з вялікім раструбам. Разгледжаны матэрыял з'яўляецца поўным і дастатковым для сістэматызацыі беларускіх аднагукавых дудаў. Параўнанне вядомых фотаздымкаў, дзе зафіксаваны дуды, і музейных экспанатаў, якія рэпрэзентуюць беларускую аднагукавую дуду, дазволілі выявіць шэраг важных адметнасцей:

- ✓ мех беларускай аднагукавай дуды заўсёды сшыты праз тасьму;
- ✓ амаль заўсёды на інструменце прысутнічае дэкарыраванне волавам (кольцы, пілападобны элемент, нахіленыя палоскі) або (радзей) іншымі матэрыяламі (жалезам, скурай);
- ✓ усе драўляныя часткі аднагукавай дуды вырабляюцца з клёну або ясеню;
- ✓ ражкі-раструбы на беларускіх аднагукавых дудах маюць закручаную форму ў 180 і болей градусаў і змайстраваны з суцэльнага кавалка дрэва;
- ✓ асноўныя акустычныя параметры іграввых трубак (унутраны дыяметр, даўжыня) з'яўляюцца інварыянтнымі (з адхіленнямі каля 5 %), што сведчыць пра кансерватыўную ладавую сістэму;
- ✓ аднагукавыя дуды маюць дэтэрмінаваную канцэнтраваную лакалізацыю (Поўнач, часткова Цэнтральная і Паўночна-заходняя часткі Беларусі).

*Трэці від – двухгукавая дуда* – падрабязна апісаны М. Нікіфароўскім. Канструкцыйна гэты від дуды ўключае скураны суцэльны мех з устаўленым у яго пераборам і двума гукамі-самародкамі (г. зн. музычная трубка суцэльная з ражком-раструбам). Выявы гэтай дуды М. Нікіфароўскі не прывёў, але ён адзначае, што дадзены від дуды быў самым распаўсюджаным на тэрыторыі Паўночнай Беларусі ў XIX ст. Аналагічныя працы таго часу (М. Анімэле, Е. Раманаў) гэты факт не пацвярджаюць, але гэта не выключае магчымасці папулярнасці дадзенага інструмента на больш ранніх этапах (да XIX ст.). Некалькі выяў двухгукавай дуды пакінуў мастак Р. Жукоўскі, дзякуючы чаму стала магчымым тэарэтычна правесці яе рэканструкцыю. Ілюстрацыя дудара П. Аненскага з двухгукавай дудой дэманструе яе лакальны характар і не супадае з этнаграфічнымі фіксацыямі М. Нікіфароўскага. Канструкцыйна дадзены від дуды папярэднічае аднагукавай дудзе і з'яўляецца яе прататыпам. Пра дэкор двухгукавай дуды нічога невядома.

*Чацвёрты від – дуда-мацянка* – адлюстраваны ў фіксацыях М. Нікіфароўскага, Е. Раманава, Н. Анімэле і інш. Адна беларуская дуда-мацянка захавалася ў Літоўскім нацыянальным музеі. Яна падрабязна даследавана аўтарам дысертацыйнага даследавання. Канструкцыйна гэты від дуды спалучае сшыты мех з устаўленым у яго пераборам з трыма гукамі ў адным перахадніку без ражкоў-раструбаў. Дуда-мацянка не мае спецыфічных канструкцыйных рыс, на ёй адсутнічае дэкор, яе нельга аднесці да ўнікальных беларускіх дудаў, бо канструкцыйна яна амаль супадае з чэшскімі "малданкамі".

*Найбольш характэрнымі* канструкцыйна-дэкаратыўнымі відамі беларускай дуды трэба лічыць *аднагукавую* і *двухгукавую* дуды. Апошняя прадстаўляе сабой менш дасканалую канструкцыйную версію аднагукавай дуды і з'яўляецца яе гістарычным прататыпам.

***У падраздзеле 2.2 "Тыпалагічныя асаблівасці ўсходнееўрапейскай групы дудаў"*** на найбольш характэрных прыкладах падрабязна разглядаюцца тыпы ўсходнееўрапейскіх дудаў адпаведна распрацаванай дысертантам тыпалогіі. Дэталёвы аналіз этнаграфічных апісанняў чатырох відаў беларускіх дудаў, музейных экспанатаў, фотаздымкаў і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дазваляе зрабіць выснову, што распрацаванай па тэрытарыяльнаму прынцыпу тыпалогіі адпавядаюць толькі аднагукавая і двухгукавая дуды. Яны маюць дачыненне да *заходняга тыпу* ўсходнееўрапейскай групы дудаў. Бязмехавая дуда і дуда-мацянка дэманструюць узаемапранікненне канструкцый. Да заходняга тыпу дудаў адносяцца таксама дуды Аўкштайціі і Жмудзі (сучасная Літва), дуды тыпу "бок" (частка Польшчы, Усходняй Германіі, Чэхіі). Літоўскія дуды канструкцыйна спалучаюць скураны мех, перабор, гук з рагаўнямі-раструбамі, аднак тут рагаўні-раструбы адрозніваюцца сваёй даўжынёй і "выцягнутасцю" ад ражкоў-раструбаў беларускай аднагукавай дуды. Дэкор волавам гэтых дудаў спалучае кольцы, пілападобны элемент, нахіленыя і прамыя палоскі. Дуды "бок" канструкцыйна спалучаюць сшыты альбо суцэльны мех, перабор з гукам і велізарнымі ражкамі-раструбамі на іх, зробленымі з натуральнага рога. Прысутнічае дэкор з волава (кольцы, пілападобны элемент), у выглядзе латуннай чаканкі (рагаўні-раструбы) і аб'ёмнай разьбы (пераважна галава казы на пераходніку пад перабор).

*Скандынаўска-балтыйскі тып* распаўсюджаны на абсягах Скандынаўскага паўвострава (Швецыя, часткова Фінляндыя), Эстоніі і часткова Латвіі. Падрабязны аналіз гэтых дудаў дае магчымасць сцвярджаць, што яны характарызуюцца наяўнасцю цыліндрычных іграявых каналаў, адзінарнымі пішчыкамі, адсутнасцю ражкоў-раструбаў (замест іх прысутнічаюць рудыментарныя раструбы ў выглядзе бочачкі), аднаго альбо двух гукаў, адсутнасцю дэкору волавам. Падабенства з беларускай дудой прасочваецца ў асноўных прынцыпах канструкцыі (цыліндрычны іграявы канал), а таксама ў малюнку тачэння гуку (латвійскія і эстонскія дуды).

*Заходнебалканскі тып* дудаў лакалізуецца ўздоўж Адрыятычнага ўзбярэжжа і раёна Босніі-Герцагавіны, Албаніі, Грэцыі і вострава Крыт. Дзякуючы разгледжаным прыкладам, можна зрабіць выснову, што канструкцыя заходнебалканскага тыпу дудаў адносіцца да глыбокай архаічнасці, а пераемнасць канструкцыі ідзе непасрэдна ад антычнага падвойнага аўлоса. Сувязь з беларускай дудовай традыцыяй тут досыць ўмоўная, выражаецца толькі ў наяўнасці скуранога меха з музычнымі трубкамі і ў прынцыпах гукавызначэння, а таксама падабенстве з бязмехавай дудой.

*Цэнтральнабалканскі тып* лакалізаваны ад Славеніі, Паўночнай Сербіі і Баната на Поўдні да Паўднёвай Польшчы і часткі Украіны. Ён не мае жорсткіх межаў распаўсюджання, таму дуды са складаным пераборам сустракаліся і ў Чэхіі, але па тыпалогіі яны ў большасці належаць да заходняй групы ўсходнееўрапейскіх дудаў. Дуды дадзенага тыпу аб'ядноўвае складаны перабор. Яны могуць быць як з ражкамі-раструбамі, так і без іх, з дэкорам волавам або без яго.

*Усходнебалканскі тып* дудаў лакалізуецца на тэрыторыях Балгарыі, Македоніі, часткова Румыніі, часткова Сербіі, Малдовы і эпізадычна – Крыма. Ён досыць падобны да беларускіх дудаў (разам з заходнім тыпам) з-за аналагічнай канструкцыі і амаль аднолькавых прынцыпаў дэкарыравання волавам (кольцы, пілападобны элемент, нахіленыя і прамыя палоскі, трохкутнікі, ромбы і інш.). Адзінае прынцыповае адрозненне ад беларускай дуды – адсутнасць ражкоў-раструбаў, замест іх прысутнічаюць рудыментарныя "закручаныя" наканечнікі.

***У падраздзеле 2.3 "Узаемасувязі ўсходнееўрапейскіх дудаў і фактары ўнікальнасці беларускай дуды"*** прааналізавана зменлівасць асноўных канструкцыйных і мастацка-дэкаратыўных прыкмет кожнага з тыпаў дудаў. Гэтыя асаблівасці зафіксаваны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аўтарам графічна. У якасці *пераменных фактараў* былі ўзяты: наяўнасць скуранога меха (сшыты або суцэльны), тып перабору (просты або складаны), наяўнасць раструба на пераборы, тып раструба (форма, памер, матэрыял), характар надзімання (удуўная трубка або механічныя мяхі), колькасць гукаў, канструкцыя гукаў, наяўнасць рагаўні-раструба на гуку, тып рагаўні-раструба, наяўнасць дэкору (волава, разьба), падобнасць арнаменту дэкору, наяўнасць вобраза казы.

Пабудаваныя карты лакалізацыі розных атрыбутаў усходнееўрапейскіх дудаў візуальна дэманструюць іх узаемасувязь (уключаючы беларускую дуду). Падобная мадэль узаемасувязей *пабудавана ўпершыню* ў дачыненні да такога інструмента, як дуда. Аналіз атрыманых лакалізацый паказвае, што беларускія дуды з'яўляюцца неад'емнай часткай усходнееўрапейскай дударскай культуры, пра што сведчаць канцэптуальныя асаблівасці яе канструкцыі і дэкору (большасць дудаў усходнееўрапейскай групы канструктыўна ўключаюць адзінарны перабор з гукам і рагаўні-раструбы ў яўнай альбо рудыментарнай форме). Наяўнасць у Беларусі дудаў прадыктавана агульным усходнееўрапейскім культурным базісам (агульныя прынцыпы пабудовы канструкцыі дудаў, выкарыстанне волава ў выглядзе кольцаў і пілападобнага элемента ў якасці дэкору). Беларускаяаднагукавая дуда ўнікальная сярод усходнееўрапейскіх дудаў паводле канструкцыі (наяўнасць "закручаных" драўляных ражкоў-раструбаў на пераборы і гуку), дуда мае сувязі са старажытнаантычнымі дыянісападобнымі культамі Усходняй Еўропы (маецца на ўвазе культ казы як атрыбут прадынісейства) і з'яўляецца ўнікальнай нават у дачыненні да найбольш блізкіх аналагаў дзякуючы асабліваму вуглу закруглення драўляных ражкоў-раструбаў на гуку і пераборы, багатаму мастацка-дэкаратыўнаму аздабленню, якое яднае беларускую дуду з балгарскай, македонскай, чэшскай, усходнегерманскай, польскай і літоўскай дудамі. Наяўнасць атрыбута казы ў беларускай аднагукавай дудзе хоць і носіць фрагментарны характар, але ўсё ж дэманструе сувязь з канцэптуальнымі палажэннямі даўніх агульных усходнееўрапейскіх культаў. Беларуская дуда-мацянка канструкцыйна звязана з чэшскімі і ўсходнегерманскімі дудамі (малданкамі), не мае дэкору.

Беларускія дуды па сваёй канструкцыі і дэкоры маюць амаль усе атрыбуты ўсходнееўрапейскіх дудаў, дэманструюць еднасць канструкцыі і ў той жа час утрымліваюць арыгінальныя часткі (форма рагаўнёў-раструбаў, малюнак дэкору волавам), што ўказвае на ўласны эвалюцыйны шлях інструмента ў межах усходнееўрапейскай культурнай прасторы.

**Раздзел трэці "Этапы, асноўныя напрамкі і тэндэнцыі вырабу беларускіх дудаў у канцы XX – пачатку XXI стагоддзя"** ўключае два падраздзелы і прысвечаны вызначэнню этапаў адраджэння вырабу беларускіх дудаў, аналізу аўтарскіх падыходаў майстроў да сучаснага працэсу вырабу дудаў у Беларусі, а таксама выяўленню яго (працэсу вырабу дудаў) напрамкаў і тэндэнцый.

***У падраздзеле 3.1 "Этапы адраджэння беларускай дуды"*** на аснове рэтраспектыўнага даследавання працэсу адраджэння вырабу беларускай дуды аўтар выдзяляе і называе чатыры галоўныя этапы: "эксперыментальны", "рамантычны", "этнаграфічны", "новы".

"*Эксперыментальны*" этап (1970-я гг.) характарызуецца з'яўленнем адзінкавых экзэмпляраў дудаў, вырабленых майстрамі І. Лычкоўскім і У. Жукоўскім, чые

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інструменты з’яўляліся спробай рэканструяваць беларускую аднагукавую дуду і адрадзіць яе. Назва этапу адпавядае падыходам гэтых майстроў да вырабу дудаў і звязана з усталяваннем аўтарскіх мастацкіх поглядаў, характарызуецца шматлікімі эксперыментамі і наватарствам.

“*Рамантычны*” этап (1980-я – пачатак 1990-х гг.) характарызуецца актыўнай дзейнасцю майстра А. Лася, які праводзіў сістэматычныя пошукі тэхналогіі па вырабе дудаў і змайстраваў больш за дзесяць інструментаў. У гэты ж час над сваімі інструментамі працуюць майстры У. Пузыня і У. Гром. Майстры паступова прыходзяць да высновы, што выраб дудаў павінен адпавядаць традыцыйным узорам. Але з-за абмежаванай колькасці неабходных тэарэтычных распрацовак у іх сфарміраваўся асабісты мастацкі погляд на рэканструкцыю дудаў: першаснай была канструкцыя, дэкор жа фактычна адсутнічаў.

“*Этнаграфічны*” этап (1990-я – пачатак 2000-х гг.) распачаўся са з’яўлення ў майстра А. Лася першых вучняў – Т. Кашкурэвіча і А. Журы. Маладыя майстры, апроч практычнага навучання, пачалі займацца тэорыяй, даследаваць канструкцыю беларускай аднагукавай дуды – экспаната Лепельскага раённага краязнаўчага музея. Вынікам такіх даследаванняў стаў выраб кожным з іх аднагукавай дуды. Менавіта на гэтым этапе ўпершыню было распачата дэкарыраванне воламаў на дудах. Важнай падзеяй стала серыя экспедыцый А. Лася і Т. Кашкурэвіча ў Віцебскую вобласць з мэтай фіксацыі этнаграфічнага матэрыялу пра дуду.

“*Новы*” этап (пачатак 2000-х гг. – наш час) звязаны са з’яўленнем новай плеяды маладых майстроў па вырабе дудаў (Д. Сухі, Ю. Панкевіч, А. Сурба), якія сталі навучацца ў А. Лася (А. Сурба) і Т. Кашкурэвіча (Д. Сухі, Ю. Панкевіч), што дало падставу для з’яўлення вучэбна-творчых аб’яднанняў – “Майстэрні А. Лася” і “Майстэрні Т. Кашкурэвіча”. У працэсе вырабу беларускіх дудаў абедзве майстэрні арыентуюцца на музейныя і іншыя аўтэнтычныя экспанаты і праводзяць мэтанакіраваную працу па ўдасканаленні традыцыйнага мастацтва вырабу дудаў. Адрозненні назіраюцца ў мастацка-дэкаратыўным падыходзе пры вырабе беларускіх дудаў, якія фіксуюцца ў дробных элементах мастацка-дэкаратыўнага аздаблення і з’яўляюцца вынікам асабістых мастацкіх поглядаў іх стваральнікаў.

Аўтарам падкрэсліваецца, што *дударскі майстар* – гэта майстар, які *поўнасцю і сістэматычна* вырабляў або вырабляе дуды пры дапамозе сталярных інструментаў з традыцыйных зыходных матэрыялаў. Дзякуючы напрамку (неатрадыцыя), які распачаў А. Лось, стала магчымым аднавіць традыцыю вырабу беларускіх дудаў абавязкова па прынцыпе пераймання (навучанне вучня ад майстра, арыентацыя пры вырабе на традыцыйныя аўтэнтычныя дуды і інш.). Таму аўтар вызначае ў якасці “*неатрадыцыйных*” майстроў А. Лася, Т. Кашкурэвіча, Д. Сухога, Ю. Панкевіча, А. Сурбу, Ц. Палуніна, а астатніх дударскіх майстроў адносіць да катэгорыі *“посттрадыцыйных”*– І. Лычкоўскі, У. Пузыня, В. Пратасевіч, С. Вінаградаў, С. Козак, В. Кульпін, М. Скрамблевіч і інш.

***У падраздзеле 3.2 “Напрамкі і своеасаблівасць сучаснай аўтарскай рэканструкцыі дуды ў Беларусі”*** раздзяленне майстроў на “неатрадыцыйных” і “посттрадыцыйных” дазволіла прааналізаваць асноўныя іх падыходы да мастацкага майстравання дудаў і вылучыць галоўныя тэндэнцыі іх вырабу. Аналіз творчай працы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кожнага з майстроў выявіў шэраг акалічнасцей, якія, тым не менш, можна абагульніць і сфармуляваць наступным чынам: "посттрадыцыйныя" дударскія майстры дэманструюць, у большасці выпадкаў, эксперыментальна-аўтарскі падыход да вырабу дудаў, а "неатрадыцыйныя" майстры імкнуцца да пераймання традыцыйных прыёмаў майстравання і дэкарыравання дудаў, арыентуюцца на традыцыйныя музейныя экспанаты і архіўныя фотаздымкі. Гэтыя *два напрамкі,* хоць і грунтуюцца на розных падыходах, але дапаўняюць адзін аднаго. Майстры, якія належаць да посттрадыцыйнага напрамку, пры вырабе дудаў займаюцца пошукам свежых ідэй у выкарыстанні новых матэрыялаў, у пабудове акустыкі, а таксама імкнуцца адаптаваць дуды да сучасных сцэнічных умоў. У сваю чаргу неатрадыцыйны падыход не дазваляе майстрам адысці ад канонаў дударскай справы, патрабуе накіроўваць яе ў традыцыйны бок рэканструкцыі дудаў. Усе майстры, што працуюць у аўтарскай манеры, дэманструюць еднасць у пошуках новага і ўдасканаленні традыцыйнай дударскай спадчыны.

Важнай *тэндэнцыяй* сучаснага майстравання дудаў з'яўляецца поўнае рэканструяванне ўсіх чатырох тыпаў беларускіх дудаў. Найбольш вывучаная і рэканструяваная – беларуская аднагукавая дуда. Двухгукавая дуда пакуль што больш вядомая з тэарэтычнага боку. Пакуль не зроблена ніводнай спробы рэканструяваць бяскорпусную дуду, хоць такія ідэі нярэдка выказваюцца. Дуды-мацянкі часткова адноўлены і пастаянна вырабляюцца, аднак пошукі аптымальных для іх акустычных параметраў і мастацка-дэкаратыўнай аздобы працягваюцца.

Такім чынам, цікавасць да беларускіх дудаў узрастае, аб чым сведчыць як з'яўленне новых майстроў, выканаўцаў, так і правядзенне штогадовых дударскіх фэстаў. Характэрная тэндэнцыя ў вырабе і рэканструкцыі беларускіх дудаў адлюстроўвае сінтэз розных канструкцыйных і дэкаратыўных элементаў айчынных дудаў, таксама прагледаюцца спробы ўстанавіць канічны раструб на перабор дуды-мацянкі, зрабіць састаўнымі (раздымнымі замест суцэльных) гукі на двухгукавай дудзе, выкарыстоўваць тэхніку дэкарыравання волавам на тых дудах, дзе яе традыцыйна не было (двухгукавая дуда, дуда-мацянка). Гэта звязана з пошукам аптымальнага па форме інструмента, які б адпавядаў традыцыйным эстэтычным канонам і адначасова з'яўляўся прэзентабельным у еўрапейскім асяроддзі. Разам з тым некаторыя традыцыйныя элементы (напрыклад, выкарыстанне драўлянай галавы казы або механічных мяхоў для надзімання асноўнага меха, суцэльны выраб інструментаў) запазычаны з суседніх культур, што сведчыць пра зацікаўленасць майстроў іншымі дударскімі традыцыямі ў большай ступені як для свядомага асэнсавання месца беларускай дуды ва ўсходнееўрапейскім, так і – шырэй – у еўрапейскім кантэксце. Важна адзначыць *сучасную тэндэнцыю* па разліку дэталей і канструкцыі дуды цалкам паводле "*залатога сячэння*", што набліжае яе да эстэтычнай *мастацкай "ідэальнасці.*

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

***Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі***

1. Дуда з'яўляецца не толькі старажытным музычным інструментам, але і атрыбутам рытуальна-музычных практык, якія ўзыходзяць да старажытных культаў. Выдзелены навуковыя гіпотэзы генезісу дудаў: міфічная, старажытнарымская, сярэднявечна-сакральная, сярэднявечна-тэхнічная, на падставе якіх вызначаны шляхі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міграцыі дудаў – дывергентны і канвергентны. Такая тэарэтычная мадэль паходжання і распаўсюджання дудаў дазваляе выдзеліць агульныя вытокі і сфармуляваць гіпотэзу генезісу беларускай дуды: беларуская дуда мела сакральна-міфічныя карані; у часы хрысціянства яна страціла сакральнае значэнне і пачала развівацца самастойна паводле формы; у XIX ст., набыўшы класічны выгляд, яна ўсё ж захавала знешнія праявы былога статусу ў міфалагічнай сістэме архаічнай культуры. Часткова гэтую гіпотэзу пацвярджаюць этымалагічныя даследаванні назваў розных усходнееўрапейскіх дудаў, у аснове якіх ляжыць канструкцыйны прынцып: спалучэнне слоў “мех”, “трубка”, “каза”. Інструменты, што трапляюць пад назву “дуда”, аб’ядноўваюць такія абавязковыя яе часткі, як скураны мех, гук (або гукі), перабор, раструбы (або іх адсутнасць). Асноўнае адрозненне ўсходнееўрапейскіх дудаў ад заходнееўрапейскіх назіраецца менавіта ў канструкцыйным прынцыпе: цыліндрычны і канічны ігравы канал. Усходнееўрапейскія дуды сістэматызаваны па тыпах паводле тэрытарыяльнага прынцыпу: заходні, заходнебалканскі, цэнтральнабалканскі, усходнебалканскі, скандынаўска-балтыйскі. Дадзеныя тыпы групуюцца па лакальных канструкцыйных асаблівасцях, што дало падставу даследаваць кожны з іх, вылучаючы агульныя і адметныя рысы лакальных дударскіх традыцый [6; 9; 11; 12; 13; 14; 17; 21].

2. Выдзелены чатыры віды традыцыйных беларускіх дудаў (бязмехавая, аднагукавая, двухгукавая, дуда-мацянка), якія не поўнасцю адпавядаюць распрацаванай аўтарам тыпалогіі. Гэта звязана з бытаваннем на тэрыторыі Беларусі ў розныя часы некалькіх розных відаў дудаў з рознымі лакалізацыямі. Класічнымі беларускімі прадстаўнікамі заходняга тыпу ўсходнееўрапейскіх дудаў трэба лічыць толькі аднагукавую і двухгукавую дуды. Яны найбольш поўна адлюстраваны ў музейных экспазіцыях, творах мастацтва і інш. Аднагукавая дуда была самай папулярнай у Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. Гэты від беларускай дуды з’яўляецца сімвалам беларускай народнай культуры. Беларуская двухгукавая дуда таксама ўпісваецца ў агульную тыпалогію ўсходнееўрапейскіх дудаў, але факты яе існавання грунтуюцца толькі на іканаграфічных дадзеных і этнаграфічных апісаннях, што робіць складаным рэканструкцыю гэтага віда інструмента і яго вяртанне ва ўжытак. Дуду-мацянку з прычыны адсутнасці рагаўнёў-раструбаў і наяўнасці трох гукаў таксама нельга аднесці да заходняга тыпу ўсходнееўрапейскай групы дудаў. Яе магчыма аднесці (у межах распрацаванай тыпалогіі) да скандынаўска-балтыйскага тыпу ўсходнееўрапейскіх дудаў. Бязмехавая дуда дэманструе сувязь з антычнай культурай і ўказвае на працяглы эвалюцыйны шлях беларускай дуды [3; 4; 5; 7; 8].

3. Заходні тып усходнееўрапейскіх дудаў уключае (апроч беларускай аднагукавай і двухгукавай дудаў) дуды Аўкштайціі і Жмудзі (сучаснай Літвы), дуды Велькапольске (сучаснай Польшчы), дуды тыпу “бок” вендаў (сучаснай Усходняй Германіі), часткова Чэхіі. Усе інструменты дадзенага тыпу дэманструюць адзінства ў выкарыстанні ражкоў-раструбаў, а таксама дэкору воламаў (кольцы, пілападобны элемент, нахіленыя палоскі і інш.). Скандынаўска-балтыйскі тып уключае дуды Даларны (сучасная Швецыя), часткова Фінляндыі, а таксама Эстоніі і характарызуецца адсутнасцю ражкоў-раструбаў і дэкору воламаў. Пад дадзены тып дудаў у большай ступені падыходзіць беларуская дуда-мацянка. Заходнебалканскі тып дудаў уключае інструменты з Босніі-Герцагавіны, Албаніі, Грэцыі і вострава Крыт. Дадзеныя інструменты з’яўляюцца прамымі нашчадкамі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

антычных аўлосаў, што яднае іх з беларускай бязмехавай дудой, дэкор адсутнічае. Цэнтральнабалканскі тып дудаў уключае інструменты з Славеніі, Паўночнай Сербіі, Славакіі, Венгрыі, Паўднёвай Польшчы і Заходняй Украіны. Інструменты дадзенай групы выразна спалучаюць рысы заходнебалканскага тыпу дудаў, у якіх разам выкарыстоўваюцца асобны гук і ражкі-раструбы (у некаторых выпадках – у рудыментарнай форме). Дэкор выкарыстоўваецца эпізадычна волавам, прысутнічаюць геаметрычная разьба і драўляная стылізаваная галава казы. Гэта сведчыць пра ўзаемапранікненне традыцый. Падабенства з беларускімі дудамі яскрава прасочваецца дзякуючы дэкарыраванню волавам (кольцы, пілападобны элемент, нахіленыя палоскі і інш.). Усходнебалканскі тып дудаў уключае інструменты з Балгарыі, Македоніі, часткова Румыніі, Сербіі, Малдовы, а таксама Крыма. Дуды дадзенай групы маюць адзінарны перабор і адзін басуючы гук (з рудыментарным раструбам). Падабенства да беларускіх дудаў назіраецца ў канструкцыі (акрамя ражкоў-раструбаў) і дэкоры волавам (кольцы, пілападобны элемент, нахіленыя палоскі і інш.) [1; 6; 19; 20].

4. Выяўленне ўзаемасувязей беларускай дуды з усходнееўрапейскімі дудамі грунтуецца на пабудове лакалізацый атрыбутаў усходнееўрапейскіх дудаў на карце Усходняй Еўропы паводле розных фактараў (наяўнасць скуранога меха, тып перабору, наяўнасць раструба на пераборы, тып раструба, характар надзімання (соска альбо мяхі), колькасць гукаў, канструкцыя гукаў, наяўнасць рагаўня-раструба на гуку, тып рагаўня-раструба, наяўнасць дэкору, падабенства арнаменту інкрустацыі, наяўнасць вобраза казы). Аналіз гэтых графічных пабудоў выяўляе наступныя акалічнасці:

- ✓ беларускія дуды з’яўляюцца неад’емнай часткай усходнееўрапейскай дударскай культуры, пра што сведчаць захаваныя канцэптуальныя асаблівасці яе канструкцыі і дэкору;
- ✓ беларуская аднагукавая дуда (а таксама бязмехавая) мае сувязі са старажытнаантычнымі дыянісападобнымі культамі Усходняй Еўропы (дэкор са стылізаванай галавой казы і інш., сакральныя атрыбуты дудара);
- ✓ беларуская аднагукавая дуда з’яўляецца непаўторнай і ўнікальнай нават у дачыненні да найбольш блізкага аналага (літоўскай дуды) дзякуючы асабліваму вуглу закруглення драўляных ражкоў-раструбаў (плаўна закручана на 180 градусаў) на гуку і пераборы;
- ✓ беларуская аднагукавая дуда дэманструе падабенства да чэшскіх, славацкіх, румынскіх, балгарскіх, усходнегерманскіх дудаў паводле тэхнікі мастацкага дэкарыравання волавам;
- ✓ дуды-мацянкі непасрэдна звязаны з чэшскімі, усходнегерманскімі дудамі-“малдаанкамі”, а па сваёй канструкцыі блізкія да скандынаўска-балтыйскага тыпу дудаў;
- ✓ беларускія дуды маюць у сваёй канструкцыі амаль усе элементы ўсходнееўрапейскіх дудаў, але пры гэтым арганічна пабудаваны і аздоблены дэкорам, што ўказвае на ўласны эвалюцыйны шлях іх развіцця [1; 6; 19; 20].

5. Адраджэнне дуды ў канцы ХХ – пачатку ХХІ ст. (чатыры этапы: “эксперыментальны”, “рамантычны”, “этнаграфічны”, “новы”) пачыналася з інтуітыўных крокаў па вяртанні забытага інструмента і вылілася ў моцны і мэтанакіраваны культурны працэс. Майстраванне дудаў апошнія 30 гадоў развівалася ў двух напрамках: посттрадыцыйным, звязаным з невычэрпным энтузіязмам і пошукамі аднаўлення дудаў, і неатрадыцыйным, распачатым майстрам А. Ласём. У 1980-я гг. творчасць А. Лася абумовіла з’яўленне трох пакаленняў майстроў, якія ў сваёй працы арыентаваліся на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аўтэнтычныя інструменты. Посттрадыцыйны напрамак накіроўвае майстроў да пошукаў свежых ідэй у выкарыстанні новых матэрыялаў, пабудове акустыкі, а таксама адаптацыі дуды да сучасных сцэнічных умоў.

У развіцці сучаснага майстравання дудаў былі вызначаны наступныя тэндэнцыі: шлях да поўнага рэканструявання ўсіх відаў беларускіх дудаў і інтэграцыя іх розных элементаў. У межах першай тэндэнцыі найбольш вывучана і даведзена да высокай якасці рэканструкцыі беларуская аднагукавая дуда. Рэканструкцыя двухгукавай дуды, больш вядомай па тэарэтычных крыніцах, не завершана. Дуды-мацянкі адноўлены і пастаянна вырабляюцца, але яшчэ застаюцца нявырашанымі пытанні эмпірычнага характару, таму пошукі аптымальных для іх (дудаў-мацянак) акустычных параметраў і дэкаратыўнага аздаблення пакуль што не спыняюцца. Другой тэндэнцыяй у вырабе і рэканструкцыі беларускай дуды з'яўляецца інтэнцыя да сінтэзу розных элементаў беларускіх дудаў. Адбываецца пошук аптымальнага інструмента (дуды), які б адпавядаў традыцыйным канонам і адначасова з'яўляўся прэзентабельным у еўрапейскім асяроддзі.

Сучасныя працэсы даследавання і вырабу беларускіх дудаў цесна звязаны з вопытам майстроў старэйшага пакалення і развіваюцца ва ўзаемадзеянні з агульнаеўрапейскімі традыцыямі. Пачынае выкарыстоўвацца разлік дэталей дуды паводле "залатога сячэння", што дазволіць наблізіць вырабленыя інструменты да "ідэалу", нават такога, які ніколі не быў уласцівы аўтэнтычным інструментам. Падобная тэндэнцыя ў дачыненні да беларускіх дудаў аказваецца аптымістычнай, бо выкарыстанне сучасных тэхнічных магчымасцей дазволіць не проста вырабляць традыцыйны інструмент, а з улікам "залатых прапорцый" зрабіць яго больш дасканалым. Гэта сведчыць пра тое, што беларуская традыцыя вырабу дудаў, захоўваючы свае адметныя рысы, трывала адпавядае еўрапейскаму мастацкаму кантэксту [2; 10; 15; 16; 18; 22; 23].

***Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў***

Тэарэтычныя распрацоўкі дысертацыйнага даследавання (сістэматызацыя гіпотэз генезісу дудаў, тыпалагізацыя, раяніраванне базавых элементаў дуды на карце, перыядызацыя этапаў адраджэння вырабу дуды) могуць быць выкарыстаны ў працэсе далейшага навуковага асэнсавання музычнай культуры, вывучэння гісторыі мастацтваў, вызначэння пераемнасці і трансфармацыі традыцый усходнееўрапейскага рэгіёна. Практычная частка дысертацыйнага даследавання дае магчымасць укараніць вынікі работы ў працэс вырабу інструментаў (прамысловых і эксперыментальных) з мэтай папаўнення музейных калекцый, выкарыстання ў духавых аркестрах, музычных установах і інш.

Праца ў цэлым можа быць карысная мастацтвазнаўцам, культуролагам, філосафам, гісторыкам, сацыёлагам, этнолагам, музеязнаўцам, музыкантам, акустыкам і інш. Аўтарскія прамалёўкі ўсіх асноўных усходнееўрапейскіх дудаў можна скарыстоўваць у розных галінах навукі ў якасці нагляднага матэрыялу. Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны падчас правядзення экскурсій (з абавязковай дэманстрацыяй і папулярызацыяй беларускіх і еўрапейскіх дудаў) у Музеі музычных інструментаў (БДУКМ) і інш. На аснове даследавання распрацаваны спецыяльны курс "Рэстаўрацыя і выраб беларускіх народных духавых інструментаў" [23], у якім асаблівая ўвага надаецца практычнаму знаёмству з беларускімі дудамі, вывучэнню іх канструкцыі і дэкору, а таксама вырабу. Падчас працы над дысертацыяй аўтарам атрымана 14 актаў укаранення практычнага выкарыстання вынікаў даследаванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных выданнях

1. Сурба, А. В. Агульныя і адметныя рысы беларускай дуды ў кантэксце еўрапейскіх аналагаў / А. В. Сурба // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2011. – Вып. 10. – С. 621–629.
2. Сурба, А. В. Праблема рэканструкцыі тэхналогіі вырабу беларускай дуды / А. В. Сурба // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2011. – Вып. 11. – С. 583–590.
3. Сурба, А. В. Асаблівасці дэкору беларускай дуды / А. В. Сурба // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2011. – № 2. – С. 66–73.
4. Сурба, А. В. Асаблівасці беларускіх аднагукавых дуд з калекцыі Расійскага этнаграфічнага музея / А. В. Сурба // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : зб. арт. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск, 2012. – Вып. 13. – С. 538–546.

### Артыкулы ў навуковых зборніках

5. Сурба, А. Асаблівасці традыцыйных дуд з музейных калекцый Беларусі / А. Сурба // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. пр. удзельнікаў V Міжнар. навук. канф., Мінск, 29 крас. – 1мая 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў [і інш.] ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.), В. В. Калацэй, С. К. Кананові́ч. – Мінск, 2011. – С. 238–240.
6. Сурба, А. В. Беларуская дуда ў кантэксце еўрапейскіх аналагаў / А. В. Сурба // Культура: открытый формат – 2011 (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, социокультурная деятельность) : сб. науч. работ / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редсовет: М. А. Можейко (пред.) [и др.]. – Минск, 2011. – С. 183–186.
7. Сурба, А. Асаблівасці беларускай двухгукавай дуды / А. Сурба // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. пр. удзельнікаў VI Міжнар. навук. канф., Мінск, 27–29 крас. 2012 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў [і інш.] ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 232–235.
8. Сурба, А. В. Асаблівасці беларускай дуды-мацянкі / А. В. Сурба // Культура: открытый формат – 2012 (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; сост.: Т. Н. Бабич, Ю. А. Переверзева, Е. Н. Шаройко ; науч. ред. М. А. Можейко. – Минск, 2012. – С. 181–186.
9. Сурба, А. В. Арганная культура ў кантэксце архетыпаў еўрапейскай цывілізацыі / А. В. Сурба // Культура: открытый формат – 2013 (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сост.: Т. Н. Бабич, Ю. А. Переверзева, Е. Н. Шаройко ; науч. ред. В. Р. Языкович. – Минск, 2013. – С. 251–258.

10. Сурба, А. Перыядызацыя станаўлення неатрадыцыі майстравання беларускіх дудаў / А. Сурба // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. пр. удзельнікаў VII Міжнар. навук. канф., Мінск, 26–28 крас. 2013 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў [і інш.] ; рэдкал.: В. Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2013. – С. 255–259.

11. Сурба, А. Генезіс беларускай дуды ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі / А. Сурба // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. пр. удзельнікаў VIII Міжнар. навук. канф., Мінск, 25–27 крас. 2014 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў [і інш.] ; рэдкал.: В. Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2014. – С. 187–191.

12. Сурба, А. Дуда і апошні подых закаванага Саціра / А. Сурба // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. пр. удзельнікаў X Міжнар. навук. канф., Мінск, 29 крас. – 1 мая 2016 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў [і інш.] ; рэдкал.: В. Р. Языковіч (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 198–202.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

13. Сурба, А. В. Музыкальный архетип и генезис волынки / А. В. Сурба // Архетипы и архетипическое в культуре и социальных отношениях : материалы междунар. науч.-практ. конф., Пенза – Ереван – Прага, 5–6 марта 2010 г. / Науч.-изд. центр «Социосфера» [и др.]. – Пенза, 2010. – С. 80–86.

14. Сурба, А. В. К проблеме изучения семантики и генезиса волынок Восточной Европы / А. В. Сурба // Этногенез и ранняя история народов Евразии : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Пенза – Прага, 5–6 апр. 2010 г. / Науч.-изд. центр «Социосфера» [и др.] ; редкол.: С. Н. Волков [и др.]. – Пенза ; Прага, 2010. – С. 129–134.

15. Сурба, А. В. Дуды-навадзелы і іх месца ў сучаснай музычнай прасторы Беларусі / А. В. Сурба // Наука и образование в условиях социально-экономической трансформации общества : материалы XIII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 15 апр. 2010 г. / Ин-т соврем. знаний ; редсовет: В. А. Мищенко (пред.) [и др.]. – Минск, 2010. – С. 98–100.

16. Сурба, А. В. Роля дударскай традыцыі ў беларускай народнай культуры / А. В. Сурба // Роля традыцый народнай культуры ў адраджэнні беларускага сяла : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., Іванава, 24 верас. 2010 г. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; уклад.: А. Г. Алфёрава, Н. С. Бункевіч. – Мінск, 2010. – С. 149–152.

17. Сурба, А. В. Дуда як атрыбут сакралізацыі / А. В. Сурба // Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 35-годдзю БДУКМ, Мінск, 3 снеж. 2010 г. : у 2 т. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – Т. 2. – С. 66–72.

18. Сурба, А. В. Працэс выкладання рэстаўрацыі і вырабу музычных інструментаў у БДУКіМ / А. В. Сурба // Совершенствование эстетического образования в XXI веке : материалы Междунар. науч.-практ. семинара, Минск, 22 дек. 2010 г. / Белорус. гос. пед. ун-т ; редкол.: Т. С. Богданова (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2010. – С. 223–225.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

19. Сурба, А. В. Беларускі духавы інструмент дуда ў кантэксце ўсходнееўрапейскай традыцыі: тыпалогія, дэкор і канструкцыйныя асаблівасці / А. В. Сурба, Г. А. Барвенава // Сборник тезисов докладов Республиканской научной конференции студентов и аспирантов Республики Беларусь «НИРС–2011», Минск, 18 октября 2011 г. / Белорус. гос. ун-т [и др.] ; редкол.: С. В. Абламейко [и др.]. – Минск, 2011. – С. 603.

20. Сурба, А. В. Да праблемы вывучэння беларускай дуды ў усходнееўрапейскім кантэксце / А. В. Сурба // Актуальные проблемы мировой художественной культуры : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. памяти проф. У. Д. Розенфельда, Гродно, 25–26 марта 2010 г. : в 2 ч. / Гродн. гос. ун-т ; редкол.: А. П. Богустов (отв. ред.) [и др.]. – Гродно, 2011. – Ч. 2. – С. 268–271.

**Артыкулы ў часопісах**

21. Сурба, А. Дуда як атрыбут сакралізацыі і дыянісійства / А. Сурба // Dudar. – 2012. – № 1. – С. 124–127.

**Артыкулы ў энцыклапедычных даведніках**

22. Сурба, А. В. Адраджэнне традыцыі вырабу дуд у канцы 20 – пачатку 21 стагоддзя / А. В. Сурба // Беларускія народныя музычныя інструменты : энцыкл. давед. / Беларус. Энцыкл. ; склад.: Т. І. Стружэцкі, В. В. Давідовіч. – Мінск, 2016. – С. 188–190.

**Вучэбныя праграмы**

23. Реставрация и изготовление белорусских народных духовых инструментов : учебная программа по специальности 1-16 01 06 Духовые инструменты (по направлениям), направлению специальности 1-16 01 06-11 Духовые инструменты (народные) / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; [сост. А. В. Сурба]. – Минск : БГУКИ, 2013. – 12 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЭЗЮМЭ

*Сурба Аляксандр Віктаравіч*

**Беларуская дуда ў кантэксце ўсходнееўрапейскай традыцыі: тыпалогія, канструкцыйныя і дэкаратыўныя асаблівасці**

**Ключавыя словы**: дуда, мастацтва, тыпалогія, канструкцыя, дэкор, генезіс, традыцыя.

**Мэта даследавання**: вызначыць канструкцыйныя і мастацка-дэкаратыўныя асаблівасці беларускай дуды і яе месца ва ўсходнееўрапейскай групе дудаў.

**Метады даследавання**: кампаратыўны, гісторыка-марфалагічны, тыпалагічны, метад аналітычнага мадэлявання, метад графічнай візуалізацыі і інш.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна**: упершыню ў айчынным і сусветным мастацтвазнаўстве падрабязна разгледжаны ўсе вядомыя беларускія дуды і праведзена іх параўнанне з усходнееўрапейскімі дудамі паводле канструкцыі і дэкору, распрацавана тыпалогія ўсходнееўрапейскіх дудаў з уключэннем у яе структуру беларускай дуды і вылучэннем найбольш характэрных яе відаў. Паходжанне беларускай дуды разглядаецца ў кантэксце ўсходнееўрапейскай культурнай прасторы, што дазваляе прасачыць прычыны яе ўзнікнення. Упершыню аналізуюцца сучасныя працэсы рэканструкцыі дуды ў Беларусі, вызначаюцца этапы, напрамкі і тэндэнцыі.

Вывучэнне беларускіх дудаў з'яўляецца надзвычай актуальным для сучаснага мастацтвазнаўства, бо паказвае ролю, якую адыграла беларуская дуда ва ўсходнееўрапейскай дударскай традыцыйнай культуры, а таксама звязвае факты разнастайнай канструкцыйнай і мастацка-дэкаратыўнай варыятыўнасці дудаў у сістэму, якая адлюстроўвае ўнікальнасць і своеасаблівасць развіцця традыцыйнай беларускай дудовай традыцыі ва ўсходнееўрапейскім кантэксце.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні**: беларускія дуды ўпершыню былі падрабязна разгледжаны паводле іх канструкцыі і дэкору, што дае магчымасць укараніць вынікі даследавання ў працэсы вырабу інструментаў (прамысловыя і эксперыментальныя) для папаўнення музейных калекцый, выкарыстоўваць у духавых аркестрах, музычных установах і інш. Праца адкрывае новыя напрамкі даследавання праблематыкі дудаў: лакалізацыя і міграцыя асноўных канструкцыйных частак дуды (неабходна фундаментальнае спалучэнне з археалагічнымі і этнаграфічнымі дадзенымі), эстэтыка традыцыйнага музычнага інструмента і інш. Аўтарскія прамалёўкі ўсіх асноўных усходнееўрапейскіх дудаў можна выкарыстоўваць у розных галінах у якасці наглядяднага матэрыялу.

**Галіна прымянення**: мастацтвазнаўства, культуралогія, этнамузыкалогія, этнасеміётыка, параўнальная міфалогія, гісторыя, педагогіка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

*Сурба Александр Викторович*
**Белорусская дуда в контексте восточноевропейской традиции: типология, конструктивные и декоратиные особенности**

**Ключевые слова**: дуда (волынка), искусство, типология, конструкция, декор, генезис, традиция.

**Цель исследования**: определить конструктивные и художественно-декоративные особенности белорусской дуды и ее место в восточноевропейской группе волынок.

**Методы исследования**: компаративный, историко-морфологический, типологический, метод аналитического моделирования, метод графической визуализации и др.

**Полученные результаты и их новизна**: впервые в отечественном и мировом искусствоведении подробно рассмотрены все известные белорусские дуды и проведено их сравнение с восточноевропескими волынками на основе конструкции и декора, разработана типология восточноевропейских волынок с включением в ее структуру белорусской дуды и выявлением наиболее характерных её видов. Происхождение белорусской дуды (волынки) рассматривается в контексте восточноевропейского культурного пространства, что позволяет проследить причины её возникновения. Впервые анализируются современные процессы реконструкции дуды (волынки) в Беларуси, определяются этапы, направления и тенденции.

Исследование белорусской дуды является чрезвычайно актуальным для современного искусствоведения, поскольку показывает роль, которую сыграла белорусская дуда в восточноевропейской дударской культуре, а также связывает факты разнообразной конструктивной и художественно-декоративной вариативности дуд в систему, которая отражает уникальность и своеобразие развития традиционной дударской традиции в восточноевропейском контексте.

**Рекомендации по использованию**: белорусские дуды впервые подробно рассмотрены относительно их конструкции и декора, что дает возможность внедрить результаты исследования в процессы изготовления инструментов (промышленные и экспериментальные) для пополнения музейных коллекций, использования в духовых оркестрах, музыкальных учреждениях и др. Работа открывает новые направления исследования проблематики дуд: локализация и миграция основных конструкционных частей дуды (необходимо фундаментальное сопоставление с археологическими и этнографическими данными), эстетика традиционного музыкального инструмента и др. Авторские графические разработки можно использовать в разных областях в качестве наглядного материала.

**Область применения**: искусствоведение, культурология, этномузыкология, этносемиотика, сравнительная мифология, история, педагогика.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## SUMMARY

*Aliaksandr V. Surba*

## BELARUSIAN BAGPIPE IN THE CONTEXT OF EAST-EUROPEAN TRADITION: TYPOLOGY, CONSTRUCTIVE AND DECORATIVE FEATURES

**Key words:** duda (bagpipe), art, typology, construction, decoration, genesis, tradition.

**The purpose of the research** is to determine constructive and art-decorative features of the Belarus duda (bagpipe) and its place in the East European group of bagpipes.

**The methods of the research:** comparative, historical, morphological, typological, analytical modeling, method, of graphical visualization, and others.

**The results of the research and their novelty:** for the first time in the domestic and world art history all the known Belarusian bagpipes are discussed in detail and compared with East European group of bagpipes on the basis of their design and decoration. Typology of East European bagpipes was worked out with the inclusion in its structure the Belarusian bagpipe and the identification of its major characteristics. The origin of the Belarusian bagpipe is considered in the context of the East European cultural space and allows to trace the causes of its origin. The modern processes of bagpipe reconstruction in Belarus are analyzed for the first time. Stages, directions and tendencies of its development are determined.

The study of the Belarusian bagpipe is extremely relevant to the contemporary art history, because it shows the role played by the Belarusian bagpipe in the East European bagpipe culture and links the facts of diverse structural, artistic and decorative variation of bagpipes into the system that reflects the uniqueness and originality of the tbagpipe tradition in the East European context.

**Usage guidelines**: the Belarusian bagpipes were first considered in detail regarding their design and decoration, which makes it possible to implement the results of the research into the processes of manufacturing musical instruments (commercial and experimental) for enriching museum collections, use in brass bands, musical institutions, etc. The paper opens new directions in the research of bagpipes: localization and migration of the main structural parts of bagpipes. A fundamental comparison with archaeological and ethnographic data is required. The aesthetics of traditional musical instruments and other author graphic developments can be used in various fields as a visual material.

**The sphere of application:** art history, cultural studies, ethnomusicology, ethnosemiotics, comparative mythology, history, pedagogy.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковае выданне

**СУРБА АЛЯКСАНДР ВІКТАРАВІЧ**

# БЕЛАРУСКАЯ ДУДА Ў КАНТЭКСЦЕ ЎСХОДНЕЕЎРАПЕЙСКАЙ ТРАДЫЦЫІ: ТЫПАЛОГІЯ, КАНСТРУКЦЫЙНЫЯ І ДЭКАРАТЫЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

***Аўтарэферат***

*дысертацыі на саісканне вучонай ступені*
*кандыдата мастацтвазнаўства*
*па спецыяльнасці 17.00.09 – тэорыя і гісторыя мастацтва*

Падпісана ў друк 21.11.2016. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,62. Ул.-выд. арк. 1,9. Зак. 204.
Наклад 60 асобнікаў.

УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
ЛП №02330/456 ад 23.01.2914.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ